# «У бяспечным, мірным і якасным фармаце»

**Сёлетнія выбары Прэзідэнта — ужо гісторыя. Аб тым, з якімі выклікамі сутыкнулася наша краіна пры падрыхтоўцы і правядзенні электаральнага працэсу і тым, як трэба, нягледзячы ні на якія ўмовы ісці сваім шляхам — шляхам захавання суверэнітэту і незалежнасці краіны — падзяліліся нашы суразмоўнікі.**
**Член Савета Рэспублікі Сяргей Сівец** выказаўся пра электаральную кампанію і ролю моладзі ў грамадска-палтычным жыцці нашай краіны.




**Па словах эксперта, любая палітычная кампанія — гэта сістэмная дыягностыка:**
— З аднаго боку, вядома, гэта дыягностыка сацыяльных запытаў, ступені задаволенасці грамадзян дзеяннямі дзяржаўнай улады, дзяржаўных інстытутаў. Наколькі грамадства і дзяржава кансалідавана, наколькі яны разам вырашаюць стратэгічныя пытанні развіцця нашай дзяржавы як суверэннай і незалежнай. З іншага боку, гэта, вядома ж, выбары тых ключавых палітычных фігур, якія ў далейшым, на працягу наступных пяці гадоў, будуць дынамічна развіваць нашу дзяржаву па ўсіх напрамках палітыкі, а таксама ўнутранай палітыкі нашай краіны.
**Сяргей Сівец адзначыў, што даволі вялікая яўка на датэрміновым галасаванні сведчыць пра тое, што мы — сталая нацыя:**
— Гэта кажа і пра тое, што людзі сапраўды падтрымліваюць той дзяржаўны курс, які на працягу гэтага трыццацігоддзя фарміраваўся ў нашай незалежнай суверэннай дзяржаве. На прэс-канферэнцыі, якая прайшла ў 11.00, мяне ўразіла інфармацыя, што ўжо больш за 2/3 маладых нашых грамадзян ужо прагаласавала. Гэта як раз паказчык таго, што ў нас забяспечана пераемнасць пакаленняў. Маладыя людзі рэалізавалі сваё выбарчае права, не засталіся абыякавымі, у адрозненне ад сваіх аднагодкаў на захадзе, дзе прагрэсуе абыякавае стаўленне да выбараў, ігнараванне іх з боку маладой часткі насельніцтва. Наша моладзь паказвае яркі прыклад патрыятызму, грамадзянскасці, грамадскага абавязку, які павінен быць уласцівы ўсім без выключэння, і нашай моладзі ў асаблівасці.

Актыўнасць выбаршчыкаў з'яўляецца сведчаннем высокага ўзроўня палітычнай культуры грамадзян, упэўнены **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Валерый Малашка:**




— У нас прысутнічае тое, што было ўласціва савецкаму часу — калі людзі ідуць галасаваць усёй сям'ёй. Гэта таксама дае такую ўпэўненасць, што людзі спакойна выказваюць сваё меркаванне, і яно — у імя будучыні.

Мне падабаецца, як рэагуе моладзь, як яна галасуе. Трэба сказаць, што гэты час з 2020 года ў частцы патрыятычнага выхавання людзей і грамадзянскасці не прайшоў дарэмна. Падораныя Канстытуцыі вельмі цёпла ўспрымаюцца маладымі людзьмі.

**Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак** упэўнены, што большасць людзей аддалі галасы за захаванне міру і згоды ў беларускім грамадстве.




— Гэта адзін з грунтоўных фактараў, які забяспечвае сацыяльны спакой, гэта тое, што нас мацуе, — лічыць ён. — Прэзідэнт наш казаў аб тым, што нягледзячы на тое, што ўсе мы розныя, усе мы — беларускі народ. Таму незалежна ад веравызнання, сваёй нацыянальнасці, кожны чалавек адчувае сябе грамадзянінам нашай краіны. І тыя, хто нарадзіўся тут, і тыя, хто прыехаў. Бо няма ніякіх размежаванняў паміж людзьмі. Наша заканадаўства гарантуе роўныя правы кожнаму чалавеку: і права на працу, і на сацыяльныя гарантыі. Таму людзі, якія прыязджаюць да нас, становяцца нашымі людзьмі.

**Эксперт па нацыянальнай бяспецы Аляксандр Цішчанка** не абмінуў тэму ацэнкі захадам электральнага працэму, ён назваў рэзалюцыю Еўрапарламента з заклікам не прызнаць выбары ў Беларусі ўмяшаннем у справы суверэннай краіны.



— З іншага боку, гэта белыя сцягі на іх крапаснай сцяне, бо яны ўжо прызнаюць перамогу канкрэтнага лідара ў нашай краіне, і заяўляюць пра гэта афіцыйна. Гучыць з іх боку гэта як крыўда, пагроза, але фармальна гэта прызнанне таго, што ў нас у краіне ёсць канкрэтны лідар.

*Пры гэтым бяспеку на гэтых выбарах эксперт ацаніў як тактоўную, а гэтыя выбары, па яго меркаванні, прайшлі ў бяспечным, мірным і якасным фармаце.*

«Палітычна нікчэмныя»: так ацаніў заявы Еўрапарламента аб нелігітымнасці выбараў у Беларусі **незалежны назіральнік з Расіі Ігар Каротчанка.**




— Сёння Еўропа — гэта вораг любой нармальнай цывілізаванай краіны. У сілу сваёй суб'ектнасці, дэградацыі палітычных элітаў, адкрытага фашызму і рознага роду працэсаў, якія прыводзяць да пагаршэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва абсалютнай большасці еўрапейскіх краін. У дадзеным выпадку Еўрапарламент не прадстаўляе інтарэсы грамадзян Еўропы. Гэта зборышча палітыкаў, часта карумпіраваных, якія штампуюць рашэнні, накіраваныя на прычыненне нам шкоды, — падкрэсліў спікер.

Закранулі эксперты і тэму методыкі апытання exit poll. Так, **старшыня Беларускага камітэта маладзёжных арганізацый Павел Алекса** расказаў аб эфектыўнасці і дакладнасці апытання выбаршчыкаў на выхадзе з выбарчых участкаў па гэтай методыцы:

— Людзі настроены пазітыўна, з задавальненнем адказваюць на пытанні. У нас ёсць такое паняцце, як адмовы ў рамках апытання. Яны, вядома, таксама маюць месца быць, але іх няшмат. Таму ў асноўным людзі адказваюць ахвотна, называюць кандыдата, за якога галасуюць, і без праблем ідуць на кантакт з інтэрв'юерамі. У прынцыпе, можна сказаць, што даследаванне праходзіла ў штатным рэжыме на ўсіх 320 участках, дзе працавалі інтэрв'юеры.




Сама методыка апытання прадугледжвае, што апытваецца не кожны, хто выходзіць з выбарчага ўчастка, а праз пэўны інтэрвал. Гэта дазваляе нам пазбегнуць неаб'ектыўнасці даных, таму што разам могуць на выбарчыя ўчасткі прыходзіць члены адной сям'і, суседзі, сябры, знаёмыя, ну і, як правіла, іх пункт гледжання будзе больш-менш аднолькавым.

- *Методыка exit poll, па словах Паўла Алексы, дазваляе атрымаць аб'ектыўны вынік.*

**Сяргей Клішэвіч: Людзі адказна і сабрана падышлі да свайго выбару**
«Як дэпутаты Палаты прадстаўнікоў мы мелі магчымасць наведваць выбарчыя ўчасткі ў якасці назіральнікаў, — расказаў Сяргей Клішэвіч. — Хачу адзначыць, што мы бачылі, што беларусы ставяцца да выбараў не проста, як да свята. Грамадзяне з пэўным пачуццём суперажывання за краіну ўспрымаюць выбары. Людзі адказна і сабрана падышлі да свайго выбару. Гэта зразумела, бо дастаткова шмат негатыўных прыкладаў сёння вакол Беларусі і ўспаміны наконт 2020 года: кожны разумее, што магло з намі быць, калі б мы не выстаялі».




Па словах парламентарыя, у тым ліку і гэта штурхае людзей да ўсвядомленага выбару і такой актыўнай грамадзянскай пазіцыі, аб чым сведчыць яўка. «Мы бачым мінімальную колькасць парушэнняў, і тое, калі яны і адбываюцца, то хутчэй за ўсё гэта тэхнічныя збоі, што, у прынцыпе, натуральна для такога вялізнага працэсу, як арганізацыя выбараў у Беларусі», — мяркуе Сяргей Клішэвіч.
Дэпутат звярнуў увагу на тое, што сёння беларусы знаходзяцца ў пачатку вялікага шляху па трансфармацыі, перадачы і арганізацыі прыходу да ўлады маладзейшых кіраўнікоў, аб чым Прэзідэнт казаў, адказваючы на пытанні журналістаў пасля галасавання. «Вельмі добра, што ў гэты гістарычны для краіны момант каля руля знаходзіцца нацыянальны лідар, якому мы ўсе давяраем і падтрымліваем, — лічыць Сяргей Клішэвіч. — І важна, што ў нас ёсць на гэты час — тое, чаго не хапае ў многіх дзяржавах. У нас сёння ёсць усё для таго, каб прайсці годна гэты шлях і далей упэўнена рухаць маладую беларускую дзяржаву да поспеху, захаваць тое, што ўмеем, і прымножыць сіламі маладога пакалення».
**Аляксандр Шпакоўскі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў — пра ацэнкі Захаду і выбар беларускага грамадства:**
— Як дэпутат Палаты прадстаўнікоў учора наведаў дзевяць выбарчых участкаў. Людзі старэйшага ўзросту ўспамінаюць выбары 1994 года і кажуць, што прыкладна такая ж атмасфера натхнення была тады. Сёння адметна, што наша моладзь актыўна ідзе на выбары. Цалкам відавочна, што вырасла палітычная граматнасць, інфармацыйная культура беларускага грамадства. Многія з тых, хто галасуе ўпершыню, зноў-такі свядома робяць выбар за моцную, суверэнную, квітнеючую Беларусь. Нас гэта, як заканадаўцаў, не можа не радаваць. Гэта значыць, што комплекс мерапрыемстваў інфармацыйнага, палітычнага, прававога, адукацыйнага характару, меры па абароне канстытуцыйнага ладу, якія мы рабілі ў перыяд з 2020 па 2024 гады, былі высокаэфектыўнымі.



У якасці парламентарыя Аляксандр Шпакоўскі сустракаўся з міжнароднымі назіральнікамі з Расіі і Бразіліі. «Яны адзначабць, што выбары праходзяць у рэчышчы нацыянальнага заканадаўства. Тыя міжнародныя назіральнікі, хто ўпершыню ў нашай краіне, адзначаюць пэўны дысананс паміж інфармацыяй, якая размяшчаецца ў мэйнстрымнай заходняй прэсе і рэальнасцю. І, натуральна, гэтыя людзі ў свае краіны панясуць праўдзівы погляд на сітуацыю ў Беларусі. Міністэрства замежных спраў краіны яшчэ напярэдадні асноўнага дня галасавання апублікавала дакументы, якія маюцца ў нашым распараджэнні, праекты адпаведных рэзалюцый еўрапейскай службы знешніх дзеянняў, якія, як бы ні было абсурдна, былі падрыхтаваны яшчэ задоўга да самага дня галасавання. Гэта і ацэнкі, і аналіз у цэлым. „Выбары ў Беларусі яшчэ не прайшлі, я на іх яшчэ не быў, але ўжо асудзіў і адпаведным чорнай фарбай запэцкаў“. Мы свае сілы на такога роду публіку траціць гэтым разам не сталі, хоць у частцы, якая датычыцца журналістаў, запрасілі цалкам розных людзей. І сёння зноў гучалі дурныя пытанні нашаму Прэзідэнту, на якія кіраўнік дзяржавы, на мой погляд, даў бліскучыя, вычарпальныя адказы».

Па словах дэпутата, сёння ў Беларусі прысутнічаюць назіральнікі не толькі з дружалюбных, але і недружалюбных краін: «Цалкам зразумелыя іх ангажаваныя пазіцыі. Некаторыя з іх прыязджаюць да нас ужо ў 5-6 раз. Яны не пытаюцца, як жыве наша краіна, якія ў нас дасягненні, праблемы, якія мэты мы перад сабой ставім, якія падыходы ва ўнутранай і знешняй палітыцы вызначаем. Іх цікавіць толькі адно — давядзенне ўласных крыклівых, крытычных, палітычна ангажаваных наратываў. Але, дарэчы, трэба сказаць, што наш Прэзідэнт бліскуча спраўляецца з гэтай гульнёй у настольны палітычны тэніс. І мячыкі, якія прылятаюць у наш бок, ляцяць ім назад. І, па-мойму, у гэтай гульні мы вядзем з велізарным лікам».

**Дэкан факультэта журналістыкі БДУ Аляксей Бяляеў** расказаў падрабязней пра медыйнае асвятленне, экспертна-аналітычную дзейнасць падчас бягучай электаральнай кампаніі:




— У Беларусі падыход быў такі: максімальна даць магчымасць неангажыраваным экспертам, журналістам, спецыялістам у галіне медыя, у галіне паліталогіі азнаёміцца з тым, як у нас пабудаваны і як арганізуюцца і сам працэс выбараў, і працэсы іх медыйнага асвятлення, і працэсы экспертна-аналітычных ацэнак. Мы бачылі неаднаразова, што да нас прыязджалі людзі і давалі такую ацэнку, што іх з задавальненнем пускаюць, ім тлумачаць усё, што яны хочуць ведаць.

Сёння я задаваў пытанне падчас прэс-канферэнцыі наконт выкарыстання экзітполаў. Мы ведаем, што насамрэч экспертнае суправаджэнне выбараў сёння, напрыклад, на Захадзе, ператвараецца ў дадатковы рычаг уплыву. Імі выкарыстоўваюцца сацыялагічныя апытанні. Розныя сацыяльныя кампаніі наймаюцца прэтэндэнтамі на тую ці іншую пасаду, і яны прасоўваюць сваю сацыялагічную карціну. Ад аб’ектыўнасці там вельмі мала што застаецца. Заказы выконваюцца з мэтай, каб павярнуць грамадскую думку ў бок таго кандыдата, які плаціць грошы.

У Беларусі вельмі асцярожны падыход да выкарыстання такіх сацыялагічных інструментаў. Мы тут зыходзім хутчэй з прынцыпу «не нашкодзь». Таму ў нас сацыялогія будзе выкарыстаная хутчэй пасля выбараў для таго, каб даць адэкватную і сапраўдную ацэнку таго, як і што ў нас праходзіла. Безумоўна, праводзіліся сацыяльныя апытанні і да пачатку выбараў. Але меркаванні людзей мэтанакіравана не публікавалі, каб не было ніякіх укідаў і маніпуляцыі грамадскай свядомасцю напярэдадні выбараў.
Экспертна-аналітычная работа вядзецца, і мы не ўтойваем таго, што ў нас ёсць знешнія назіральнікі, эксперты. Але мы імкнемся, каб на меркаванне народа не было аказана загадзя ніякага ціску, — падкрэсліў Аляксей Бяляеў.
Першае, што характарызуе дзень выбараў — спакой і цішыня. Пра гэта заявіў **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч**.




«Дзеючы Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што хацелася б, каб электаральная кампанія па выбарах Прэзідэнта завяршылася гэтак жа спакойна, як і пачалася. Я веру, што гэтыя цішыня і спакой захаваюцца на цэлы дзень. Мы ведаем, якая на ўчорашні дзень была даволі вялікая лічба тых, хто прагаласаваў датэрмінова, і хто сёння, безумоўна, вызваліў сябе ад паходу на выбарчыя ўчасткі. З усіх пунктаў гледжання — усё арганізавана на дастаткова высокім узроўні. Тут мы бачым той аб'ём працы ў інфармацыйным цэнтры, які прарабіла Цэнтральная выбарчая камісія, бачым і стойкі з літаратурай, колькі цудоўных кніг было выпушчана. Асабліва ўражвае, што і маладым выбаршчыкам перадаецца кніга „Сімвалы суверэннай Беларусі“. У гэтай кнізе раскрываюцца як дзяржаўныя сімвалы, так і нацыянальныя сімвалы. Мне здаецца, што гэты добры настрой паспрыяе на правільны выбар усіх грамадзян нашай краіны».
Старшыня Саюза пісьменнікаў узгадаў і канцэрт «Час выбраў нас», які адбыўся напярэдадні сённяшняга свята — асноўнага дня галасавання — на «Мінск-Арэне»: «*Было відаць, як шчаслівыя маладыя людзі выяўлялі свае эмоцыі. Я спадзяюся, што гэта таксама і сёння праявіцца ў актыўнасці маладых грамадзян, асабліва ў тых, хто галасуе ўпершыню*».
**Першы касманаўт у гісторыі суверэннай Беларусі Марына Васілеўская** падзялілася святочным настроем пасля наведвання выбарчага ўчастка.



— Сёння свята і гэта адчуваецца. Я стрымлівала сябе, каб не пайсці на датэрміновае галасаванне, бо мне вельмі нецярпелася прагаласаваць. Але ўсё ж хацела зрабіць гэта ў самы значны для нашай краіны дзень. І сёння з выдатным настроем паехала на свой участак і прагаласавала.

**Рэктар БДУІР Вадзім Богуш** у інфармацыйным цэнтры ЦВК расказаў карэспандэнтам, што прагаласаваў сёлета датэрмінова па месцы жыхарства. Таксама ў ходзе гутаркі ён падкрэсліў асаблівае месца беларускай моладзі ў выбарчым працэсе:




— Электаральная кампанія — важная, адказная для краіны падзея. Варта адзначыць, што цікавасць да яе з боку падрастаючага пакалення высокая. Дарэчы, больш за 95 працэнтаў студэнтаў БДУІР прагаласавалі на выбарах Прэзідэнта датэрмінова. У дзяўчат і юнакоў завяршаецца сесія, і многія праводзяць выхадныя ў коле сям'і. Але ж калі вырашаецца твая будучыня, праяўляць абыякавасць нельга.

Мы бачым высокую ўцягнутасць моладзі ў грамадскае і палітычнае жыццё краіны. Нашы студэнты ўсведамляюць, што будуць неўзабаве развіваць краіну далей, — гэта ў паводзінах моладзі становіцца важным стрыжнем, — адзначыў Вадзім Анатольевіч.

Карэспандэнт «Звязды» ў інфармацыйным цэнтры ЦВК распытала ў **рэктара БДУКМ Наталлі Карчэўскай** пра яе назіранні і ўражанні ад выбарчай кампаніі:




— На мой погляд, сёлетняя выбарчая кампанія вызначаецца вельмі высокім узроўнем арганізацыі, — падкрэсліла Наталля Уладзіміраўна.

—Як ніколі адчуваецца святочная атмасфера і адсутнічае элемент трывожнасці, які меў месца быць у папярэдняй выбарчай кампаніі. Нарэшце, спадзяюся, пераважная большасць нашага насельніцтва зразумела і свядома падыходзіць да таго, што выбар людзей — гэта толькі іх выбар, а не тое, што падказалі ў тэлеграм-каналах або ў іншых сацыяльных сетках. Прэзідэнцкія выбары ў 2025 годзе — асаблівыя, — рэзюмавала яна.